# Прыкладныя тэксты для кантрольнага дыктанта

## Красавік

Красавік — месяц першых дажджоў. Сонца грэе ўсё цяплей. На вярбе ***з'яўляюцца*** коцікі. Прылятаюць з цёплых краёў пералётныя птушкі. Добра ў красавіку ў лесе. Паветра тут чыстае і празрыстае. (28 слоў)

## Раніца

Ярка свяціла сонца. На траве і дрэвах была раса. Выбег Сцёпка ў сад. Дакрануўся да лісточка. Расінка засталася на пальцы. Глянуў хлопчык на расінку і ўбачыў у ёй маленькае сонейка. (30 слоў)

## Блакітныя зорачкі

Васількі растуць побач з жытнёвымі каласамі. За ***прыгажосць*** іх называюць блакітнымі зорачкамі. Кветку васілька можна ўбачыць на беларускіх вышыванках, ручніках. Гэта адзін з сімвалаў Беларусі. (25 слоў)

## Вясна

Вясновае сонейка абудзіла прыроду. Дрэвы апранулі зялёнае ўбранне. Птушкі будуюць гнёзды. Гудзяць пчолы. Працавітыя мурашкі цягнуць травінкі і лісцікі ў мурашнік. Матылькі машуць крыльцамі над духмянымі кветкамі. (27 слоў)

*Выдзеленыя словы пажадана запісаць на дошцы і звярнуць увагу дзяцей на іх правапіс.*